**Падпіска-2007**

**СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ЧАЦВЁРТЫ КВАРТАЛ**

**ІДЗЕ ПАДПІСКА НА 4-Ы КВАРТАЛ 2007 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях, устаноўлены з 01.07.2007 г.)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8200 | 24600 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 7850 | 23550 |
| 63858 (ведамасны) | 13000 | 39000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 11850 | 35550 |

**СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.**



*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 ВЕРАСНЯ 2007 г. АЎТОРАК № 176 (26041)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


## Настаў час падвесці рысу пад перыядам хаосу і неразбярыхі ў адносінах Беларусі і Грузіі

**Беларусь поўная рашучасці аднавіць і пашырыць адносіны з Грузіяй, заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 17 верасня на сустрэчы з міністрам унутраных спраў Грузіі Іване Мерабішвілі.**

«Я вельмі рады, што сёння, тым і знамянальны ваш візіт, мы маем магчымасць падвесці рысу пад перыядам хаосу і неразбярыхі, вызначэння нашых узаемаадносінаў. Мы рашуча настроены на добрыя адносіны з Грузіяй, поўныя рашучасці зрабіць іх больш высокімі, чым у часы Савецкага Саюза», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Сведчаннем таго, паводле яго слоў, з'яўляецца адкрыццё ў Мінску пасольства Грузіі, а ў хуткім часе і ў Грузіі беларускай дыпламатычнай місіі.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што этапы ва ўзаемаадносінах дзвюх краін былі рознымі, аднак «грузіны яшчэ з савецкіх часоў застаюцца для беларусаў блізкімі людзьмі». Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што сёння склаліся добрыя адносіны і з прэзідэнтам Грузіі Міхаілам Саакашвілі.

Гаворачы аб тавараабароце дзвюх краін, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго сённяшні ўзровень не адпавядае патэнцыялу Беларусі і Грузіі. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, неабходна імкнуцца павялічыць аб'ёмы двухбаковага гандлю як мінімум да $100 млн у год. Што датычыцца пытанняў бяспекі, Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь гатова ўсяляк садзейнічаць выбудоўванню адносінаў у гэтай сферы.

У сваю чаргу Іване Мерабішвілі выказаў надзею, што праз два-тры гады адносіны паміж дзвюма краінамі будуць больш інтэнсіўнымі і рэзультатыўнымі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў...

**...Віктара Зубкова з назначэннем на пасаду старшыні ўрада Расіі**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 15 верасня павіншаваў Віктара Зубкова з назначэннем яго на пасаду старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі і з днём нараджэння. «Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі нам удасца выкарыстаць бясцэнны патэнцыял двухбаковага ўзаемадзеяння на карысць беларускага і расійскага народаў», — гаворыцца ў віншаванні.

**...прэзідэнта Мексікі з Днём абвяшчэння незалежнасці**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 верасня ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў прэзідэнта Мексіканскіх Злучаных Штатаў Феліпе Кальдэрона Інахосу з нацыянальным святам — Днём абвяшчэння незалежнасці.

**...трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя з 70-годдзем**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 верасня павіншаваў легендарнага беларускага спартсмена, трохразовага алімпійскага чэмпіёна, старшыню Беларускай федэрацыі барацьбы Аляксандра Мядзведзя з 70-годдзем.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прэзідэнт Беларусі накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям II Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета

Другі год запар на сцэнічных пляцоўках Беларусі накопліваецца бясцэнны вопыт у арганізацыі і правядзенні акцый такога ўзроўню, праходзяць выступленні выдатных салістаў, адточваецца майстэрства таленавітых музыкантаў, адзначаецца ў пасланні. «Няхай і ў далейшым гэты прадстаўнічы форум прыносіць людзям высокія ідэалы духоўнасці, прыгажосці, міру і дабра», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**Прамая лінія**

## МЕДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА: ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

Змены, якія адбываюцца апошнім часам у галіне аховы здароўя, без перабольшвання, датычацца кожнага з нас. Між тым, ці ўдалося палепшыць якасць і павялічыць даступнасць медыцынскіх паслуг, вывесці іх на сучасны ўзровень? На ўсе пытанні чытачоў «Звязды» адкажа ***начальнік упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Ігар Уладзіміравіч БРОЎКА.***

**Наша «прамая лінія» пройдзе 21 верасня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах: (8-017) 292-38-21 і 292-38-92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287-17-57.**

## ПАРАСОН НА ДВАІХ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



*Юная майстрыха з вёскі Любяча Уздзенскага раёна Настасся МІГУН.*

## Хутка будзе вызначана дата правядзення Саўміна Саюзнай дзяржавы

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Паўлам Барадзіным.**

Як адзначыў кіраўнік беларускага ўрада, «важна, што парадак дня маючага адбыцца саюзнага Саўміна ўжо вызначаны. Галоўнае пытанне дня — праект саюзнага бюджэту на 2008 год».

**БЕЛТА.**

## МАЛАДАЖОНАМ ПАШАНЦАВАЛА

**Аб гэтым нам паведаміў дырэктар абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Гомельлатарэя» Леанід Кандратаў. Андрэй і Наталля Голубевы адзначылі сваё вяселле, стаўшы мужам і жонкай 11 жніўня сёлета.**

У той дзень хтосьці падарыў ім некалькі латарэйных білетаў, адзін з якіх аказаўся самым дарагім падарункам. Білет быў выйгрышным — на 15 млн рублёў! У апошнім розыгрышы гамяльчанін, прозвішча якога пакуль невядомае, выйграў аўтамабіль і Джэк-пот на агульную суму больш як 150 млн рублёў. Па аднаму з тыражоў пенсіянерцы з Рэчыцы дасталася легкавушка «Аўдзі-4», а жыхар Буда-Кашалёўскага раёна выйграў 15 млн рублёў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## «ДАГАВОРНЫ» ХАБАР

**Генеральная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу супраць чыноўніка Міністэрства спорту і турызму, а таксама аднаго з кіраўнікоў алімпійскага комплексу «Стайкі».**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры генпракуратуры, у поле зроку праваахоўных органаў трапілі начальнік аддзела інвестыцый Мінспорту і кіраўнік рамонтна-будаўнічага ўчастка РУП «Алімпійскі спартыўны комплекс «Стайкі». Кіруючая асоба спарткомлексу падазраецца ў падбухторванні да дачы хабару за станоўчае вырашэнне пытання аб заключэнні дагавора на выкананне будаўнічых работ, чыноўнік Мінспорту — у атрыманні хабару. Абодва зараз знаходзяцца пад вартай.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## «КАМУНАРКА» ЗАВАЯВАЛА МЕДАЛІ НА ДЭГУСТАЦЫЙНЫМ КОНКУРСЕ

**Прадукцыя кандытарскай фабрыкі «Камунарка» заваявала два залатыя і адзін сярэбраны медалі на дэгустацыйным конкурсе «Лепшы прадукт года-2007», які традыцыйна праходзіць напярэдадні 16-й міжнароднай выстаўкі World Food Moscow у Маскве, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка ўпраўлення продажаў беларускага прадпрыемства Галіна Падзюнас.**

Залатых медалёў удастоена новая прадукцыя «Камунаркі» — наборы шакаладных цукерак «Камунарка-VIP» і «Сувенірны набор», сярэбранага — шакалад «Мінскі», «Беларускі», «Камунарка».

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### СЁННЯ САМЫ ЦЁПЛЫ ДЗЕНЬ НА ТЫДНІ

**Як паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава, сёння будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі ўдзень у Брэсцкай, Гродзенскай і па захадзе Віцебскай вобласці пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўдзень дасягне 18—23 градусаў цяпла.**

Ужо ў сераду надвор'е пагоршыцца. На большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца дажджы. Тэмпература паветра ўдзень 19 верасня — 12—18 градусаў цяпла, толькі ў Гомельскай вобласці будзе яшчэ да 21 градуса вышэй за нуль. У наступныя дні, 20—21 верасня, у начныя гадзіны будзе ад 4 да 10 градусаў цяпла, а на тарфяніках Палесся магчымы слабыя замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад 11 градусаў цяпла на поўначы да плюс 18 градусаў на поўдні краіны.

**БЕЛТА.**

### УТРЫМАННЕ «БАЙЦОВЫХ» САБАК У ШМАТКВАТЭРНЫХ ДАМАХ ВАРТА ЗАБАРАНІЦЬ?

**Утрыманне сабак «байцовых» парод у шматкватэрных жылых дамах павінна быць забаронена. Такую думку ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» выказала намеснік старшыні Камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Марыя Худая.**

Паводле яе слоў, утрыманне такіх патэнцыйна небяспечных для людзей парод (пра трагічны выпадак, калі стэфардшырскі тэр'ер смяротна параніў пяцімесячную дзяўчынку, «Звязда» паведамляла 15 верасня) трэба дазволіць толькі на «прыдваровай тэрыторыі» прыватных дамоў. Пры гэтым тэрыторыя павінна быць абнесена надзейным плотам. Дэпутат таксама нагадала, што сёння ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца на дапрацоўцы праект Закона «Аб абыходжанні з жывёламі». Паводле слоў Марыі Худой, дакумент не забараняе ўтрыманне нейкіх парод сабак у шматкватэрных дамах, але вызначае спецыяльныя правілы для абыходжання з сабакамі, паводзіны якіх характарызуюцца непрадказальнасцю. «Спіс такіх парод вызначаны супрацоўнікамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». У прыватнасці, усе ўладальнікі такіх сабак «павінны праходзіць інструктаж аб правілах абыходжання з імі». Акрамя таго, да ўладальнікаў такіх парод прад'яўляюцца больш жорсткія патрабаванні, напрыклад, пры выгуле сабак на вуліцы. Парламентарый дадала таксама, што дэпутаты плануюць склікаць праз некалькі тыдняў пасяджэнне «круглага стала», на якім мяркуецца абмеркаваць законапраект.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

### ВОСЕМ АЎТАШКОЛ СПЫНІЛІ ДЗЕЙНАСЦЬ

**Паводле інфармацыі Міністэрства транспарту і камунікацый, восем вучэбных арганізацый спыняюць аказанне паслуг па падрыхтоўцы вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў катэгорый «В», «С». Тэрмін дзеяння сертыфіката адпаведнасці ў іх або ўжо скончыўся, або скончыцца ў бліжэйшы час.**

Аб спыненні дзейнасці па аказанню паслуг па падрыхтоўцы вадзіцеляў паведамілі вучэбныя арганізацыі: аддзела адукацыі Карэліцкага, Свіслацкага і Шклоўскага райвыканкамаў; установы адукацыі «Светлагорскі міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат», «Дзяржаўны цэнтр пазашкольнай работы г. Наваполацка», «Вучэбны камбінат падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аддзела адукацыі Івацэвіцкага райвыканкама», «Праўдзінскае ГПТВ № 111 будаўнікоў»; Краснаслабодскі філіял унітарнага прадпрыемства «Мінская абласная аўтамабільная школа».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЗГАРЭЛА МАШЫНА ІНШАЗЕМЦА

**А трэцяй гадзіне дня на дарозе Полацк—Міёры—Браслаў каля вёскі Хацькова вадзіцель польскай фірмы не справіўся з кіраваннем «Рэно-Магнум АЕ-430» з паўпрычэпам. Аўто апынулася ў кювеце, дзе сутыкнулася з прыдарожным дрэвам і пачало гарэць.**



Фота БЕЛТА.

Агонь поўнасцю знішчыў і аўто, і прычэп. У выніку гэтага ДТЗ вадзіцель атрымаў значныя цялесныя пашкоджанні і быў шпіталізаваны. Сума страты ўстанаўліваецца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## РАСІЯНІН «ЗГУБІЎ» 15 000 ЕЎРА...

З буйной сумай грошай «развітаўся» расійскі грамадзянін, які неабачліва пакінуў у аўтамабілі барсетку з СКВ. Здарэнне адбылося ў Мінску на вуліцы Альшэўскага, дзе расіянін, які праязджае ў Германію, прыпаркаваў на ноч сваю машыну. А раніцай яго чакаў непрыемны сюрпрыз — з аўтамабіля знікла барсетка, у якой знаходзілася 15 тысяч еўра і 1500 долараў ЗША. Пошукам зламыснікаў зараз займаюцца праваахоўнікі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## СЛЕДЧЫ ЗАСТРЭЛІЎСЯ

Яму было, як паведамілі нам у прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама, 38 гадоў. У другім аддзяленні РАНС адміністрацыі Чыгуначнага раёна ён карыстаўся аўтарытэтам. Перш чым націснуць на курок пісталета ў сваім службовым кабінеце, ён пакінуў перадсмяротную запіску аб тым, што ў яго невылечная хвароба. Усе абставіны справы вывучае пракуратура.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Афіцэры абвінавачваюцца ў аферы

**Генеральная пракуратура Беларусі накіравала ў Вярхоўны Суд крымінальную справу, у якой фігуруе шэраг былых службовых асобаў Міністэрства абароны.**

Паводле звестак прэс-цэнтра генпракуратуры, на лаве падсудных неўзабаве апынуцца 5 чалавек, якія абвінавачваюцца ў аферах карупцыйнага кшталту. Арганізатарам злачыннай групы, як вынікае з папярэдняга расследавання справы, з'яўляецца спадар Т. — колішні начальнік службы ракетна-артылерыйскага ўзбраення Узброеных Сіл Беларусі. На думку следчых Генеральнай пракуратуры, менавіта гэты высокапастаўлены афіцэр разам з некаторымі падначаленымі і дырэктарам аднаго з прадпрыемстваў з карыслівай зацікаўленасці арганізаваў у 2001—2003 гадах незаконную перадачу і продаж па заніжаным кошце вайсковай тэхнікі, што падлягала спісанню. У выніку гэтай карупцыйнай аферы беларускай дзяржаве быў нанесены матэрыяльны ўрон на суму каля 2 млрд рублёў. Адметна, што экс-начальніка службы ракетна-артылерыйскага ўзбраення спадара Т. за карупцыйныя злачынствы будуць судзіць ужо ў другі раз. У маі гэтага года Вярхоўны Суд краіны прызнаў яго вінаватым у хабарніцтве і злоўжыванні службовым становішчам і прыгаварыў да 11 гадоў пазбаўлення волі. Дарэчы, у той злачыннай групе, што складалася з 9 чалавек, быў таксама і ўплывовы чыноўнік Міністэрства эканомікі, які атрымаў 9 гадоў пазбаўлення волі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

Уік-энд

# Да сонца ў келіху і піва ў кубку

**«Пейте пиво — оно вкусно и на цвет красиво!» — прапаноўваў герой фільма «Сем старых і адна дзяўчына». Прыкладна тое ж самае запрашаюць зрабіць арганізатары 4-га «Кубка Піва», што пройдзе ў спартыўна-аздараўленчым комплексе «Лагойск» у бліжэйшыя выхадныя, 22—23 верасня. Нездарма ж аснова піўнога фестывалю — народная дэгустацыя, па выніках якой напрыканцы фірмы-вытворцы самага смачнага піва атрымліваюць дыпломы і ўзнагароды.**





Фота Пятра ФАМІНА.

Па традыцыі мерапрыемства нагадвае славуты «Актоберфэст» — нацыянальны піўны фестываль, які штогод праходзіць у Германіі. Беларускі ж фэст сёлета аб'ядноўвае буйнейшых вытворцаў нашай краіны. «Крыніца», «Аліварыя», «Рэчыцапіва», «Брэсцкае піва», кампанія «Сябар», «Лідскае піва», сталічны рэстаран-піваварня «Ракаўскі бровар», расійская кампанія «Балтыка», а таксама дыстрыб'ютары вядомых марак імпартнага піва «Піўны рад» і «Ліска-Плюс» прадставяць сваю лепшую прадукцыю. Наведвальнікі будуць ацэньваць рэкордна шырокі асартымент самага рознага піва — светлага, цёмнага, безалкагольнага... Вопыт папярэдніх двух гадоў паказаў, што на фэсце выпіваецца не менш як 11 000 літраў янтарнага напою, а сёлета арганізатары чакаюць перавышэння гэтай лічбы.

Але ж — «не півам адзіным», яшчэ абяцаецца мноства гандлёвых пунктаў са смачнай ежай. Смажаныя рабрынкі, кілбасы, дранікі — адзін толькі пералік традыцыйных закусак «да піва» выклікае апетыт і слінкі... Зрэшты, святам жывата справа не скончыцца. Яшчэ ж ёсць вялікая музычная і забаўляльная праграмы.

Галоўнай інтрыгай фестывалю стане барацьба за «Кубак піва» — самы сапраўдны драўляны куфель ручной работы. Яго атрымае той з удзельнікаў, хто назбірае больш за ўсіх драўляных жэтонаў (так званых «бірдэкеляў»). Іх, у сваю чаргу, можна атрымаць, набываючы чарговы куфель піва альбо ўдзельнічаючы ў шматлікіх «піўных» спаборніцтвах. Напрыклад, 22 верасня ў праграме фестывалю — конкурс-эстафета «Генеральскія пагоны», «Піўны футбол» і «Піўная сімфонія», «Вясельны забег», гульня «Перапі суседа» і г.д. У гэты дзень а 16-й гадзіне адбудзецца цырымонія ўрачыстага адкрыцця фестывалю — з удзелам пасла Германіі ў Рэспубліцы Беларусь. А пачнецца свята, між іншым, з адкрыцця кегі піва, спецыяльна прывезенага на беларускі фестываль з Германіі.

23 верасня ахвотныя змогуць пацвердзіць, што шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз піва, а таксама прыняць удзел у конкурсах кшталту «Пенадуў», «Піўны баскетбол», «Чую піва за вярсту». Гэтаксама будуць выбраны «Піўны кароль» і «Піўная фройляйн». Акрамя таго, два дні практычна ў рэжыме нон-стоп на адкрытых канцэртных пляцоўках выступаюць беларускія і замежныя калектывы — гурты «Ячменны солад», «Дразды», «Leons», «Каты» і хэдлайнеры музычнай часткі, спецыяльныя госці з Германіі, гурт «Ageless». Наведаць свята і трапіць дадому госці змогуць з дапамогай маршрутак, якія падчас свята будуць курсіраваць ад аўтавакзала «Маскоўскі» да ДСАК «Лагойск».

На думку арганізатараў, штогадовы фестываль «Кубак піва» адлюстроўвае стан піўной вытворчасці ў нашай краіне і перавагі беларусаў. Напрыклад, вялікім попытам у спажыўцоў падчас фэсту карыстаецца менавіта айчыннае піва. Увогуле, спецыялісты адзначаюць, што з павышэннем сацыяльнага дабрабыту ў краіне за апошнія гады намецілася тэндэнцыя выцяснення моцнага алкаголю слабым, але пакуль што ўзровень спажывання піва ў Беларусі ў 1,5 раза ніжэйшы, чым у Расіі, і ў 3—4 ніжэйшы, чым у Германіі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## МАЎЧАННЕ НАРКАКУР'ЕРАЎ

**Буйную партыю гашышу выявілі айчынныя мытнікі на польска-беларускай мяжы.**

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, у пункце пропуску «Брэст—Цярэспаль» падчас афармлення аўтобуса, які вёз пасажыраў з Парыжа ў Маскву, у чамадане 49-гадовага расіяніна было выяўлена 6,2 кілаграма падазронага рэчыва расліннага паходжання. Праведзеныя тэсты засведчылі, што гэта — гашыш. Атрымаць нейкія тлумачэнні ад гаспадара кантрабанднага тавару мытнікі самастойна не змаглі. Наркакур'ер маўчаў у літаральным сэнсе слова як нямы. Мытнікам давялося размаўляць з ім праз адмысловага перакладчыка. Неўзабаве ў поле зроку барацьбітоў з кантрабандыстамі апынуліся яшчэ трое грамадзян Расіі. У іх валізах мытнікі знайшлі аналагічны гашыш агульнай вагой больш за 20 кілаграмаў. З «троіцай» наркакур'ераў таксама давялося размаўляць жэстамі. Аднак пакуль што дакладна невядома, ці сапраўды «трафікёры кайфу» нямыя. У мытнікаў ёсць падазрэнне, што кантрабандысты артыстычна прытвараюцца, спадзеючыся на паблажлівасць праваахоўных органаў нашай краіны. Зрэшты, нават калі перавозчыкі гашышу насамрэч нямыя, гэта не вызваляць іх ад адказнасці. Па фактах кантрабанды наркотыкаў узбуджана крымінальная справа.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УКРАІНА ЗРОБІЦЬ ЧАЭС БЯСПЕЧНАЙ НА 100 ГАДОЎ?

**Учора ва Украіне падпісаны два кантракты па пераўтварэнню Чарнобыльскай АЭС у экалагічна бяспечны аб'ект.**

Першы з іх заключаны з французскім кансорцыумам «Novarka» і датычыцца будаўніцтва новага аб'екта ўкрыцця для чацвёртага блоку станцыі. Цана пытання — 505 млн долараў, тэрмін рэалізацыі — 5 гадоў. Новае ўкрыццё павінна забяспечыць бяспеку станцыі як мінімум на сто гадоў. Другі кантракт, падпісаны з амерыканскай кампаніяй «Holtec», датычыцца будаўніцтва сховішча для адпрацаванага ядзернага паліва. Гэты праект ацэньваецца ў 200 млн долараў, а тэрмін яго рэалізацыі складзе 52 месяцы.

### ЭКСТРАСЭНС КАШПІРОЎСКІ ПРАДКАЗАЎ РАЗВАЛ РАСІІ



**Расія ў бліжэйшыя гады распадзецца на феадальныя княствы, і перашкодзіць гэтаму не зможа нават самы магутны прэзідэнт. Пра гэта заявіў вядомы ў мінулым экстрасэнс Анатоль Кашпіроўскі.**

На думку экстрасэнса, сучасная Расія — дзяржава ўжо феадальная, бо складаецца з феадальных княстваў. «Я думаю, што нават пры ўсіх намаганнях нават самых лепшых кіраўнікоў існуе вялікая верагоднасць распаду Расіі на асобныя княствы. Зараз ужо Далёкі Усход можа адысці да Кітая», — сказаў Кашпіроўскі.

### КАРОВЫ АД ПАРТЫІ РЭГІЁНАЎ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ ЦІМАШЭНЦЫ СУСТРАКАЦЦА З ВЫБАРШЧЫКАМІ



**Удзельнікі перадвыбарнай кампаніі на Украіне абмяняліся экстравагантнымі заявамі. Так, Юлія Цімашэнка абвінаваціла «рэгіяналаў» у тым, што ёй перашкаджаюць праводзіць перадвыбарную кампанію: шумяць на мітынгах, заглушаюць іх дэльтапланамі і, нарэшце, выводзяць кароў, каб перакрыць дарогі.**

У партыі рэгіёнаў на такія заявы лідара БЮЦ адгукнуліся прэс-рэлізам: партыя не мае дачынення да буйной рагатай жывёлы, прыродных з'яў, а заадно і «працэсаў, якія адбываюцца ў галаве лідара БЮЦ, і выплюхваюцца ў грамадства ў выглядзе ўсялякай лухты». Прэс-служба Партыі рэгіёнаў таксама выказала меркаванне, што каровы, пра якіх гаворыць Цімашэнка, магчыма, «хацелі сустрэцца з лідарам БЮЦ у нефармальнай абстаноўцы».

### КІТАЙСКІ АМАТАР ВІРТУАЛЬНЫХ ЗАБАЎ ПАМЁР ЗА КАМП'ЮТАРАМ

**Кітайскі аматар віртуальных забаў памёр прама за камп'ютарам у адным з Інтэрнэт-кафэ Пекіна.**

Паводле інфармацыі кітайскіх СМІ, смерці папярэднічалі тры дні амаль бесперапыннага знаходжання ў сетцы. Урачы «хуткай», якія прыбылі ў кафэ, не здолелі выратаваць 30-гадовага мужчыну. Найбольш верагоднай прычынай смерці названы сардэчны прыступ.

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.09.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 149,00 |
| 1 еўра | 2 980,13 |
| 1 латвійскі лат | 4 248,29 |
| 1 літоўскі літ | 863,07 |
| 1 чэшская крона | 108,61 |
| 1 польскі злоты | 787,84 |
| 1 расійскі рубель | 84,84 |
| 1 украінская грыўня | 428,94 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 25,3286 |
| 10 UAH | 50,3361 |
| 1000 BYR | 11,7705 |
| EUR | 35,1358 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.09.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*



ISSN 1990 - 763X



КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже административно-производственного здания (общ. пл. 734,8 кв.м), расположенного по адресу: г. Орша, ул. Белинского, 1а. Площадь земельного участка 0,2240 га. Начальная цена снижена на 20% и составляет – 213 580 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.06.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 02.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 01.10.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224-61-34. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже легковых автомобилей: Лот № 1: «БМВ-740», 1997 г.в., 4,3 бензин, черный, начальная цена – 14 630 000 бел. рублей с НДС; Лот № 2: «Вольво-850», 1995 г.в., 2,4 бензин, белый, начальная цена – 4 110 000 бел. рублей с НДС. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 18.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.10.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактныq телефон (8017) 224-61-34 Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

ЗАО «АВТОКОМБИНАТ № 3» СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже Раковского деревообрабатывающего производства в составе зданий: здание лесопильного цеха (об. пл. 3743 кв.м), здание столярного цеха (286,3 кв.м), здание мастерской (63,7 кв.м), здание конторы (143 кв.м), здание склада (35,2 кв.м), здание котельной (15,5 кв.м), навес для пилорамы (155 кв.м) и оборудования: станок прирезной лесопильный – ЦМР ИМ 1997 г.в., станок строгальный – МП – 9 -1675 – 001 – 1993 г.в., станок рейсмусовый МП – 9 – 1669 – 1993г.в., станок торцовочный – ТСН – 2000 г.в., пилорама – ЛВР – 1 (РПМ) – 1973 г.в., расположенных по адресу: Воложинский район, д. Раков, ул. Пионерская, 26. Площадь земельного участка 2,08 га. Начальная цена – 271 400 000 бел. руб. с НДС. Задаток 10% от начальной цены и перечисляется на р/с № 3012020200010, Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи подписывается в течение 10 дней после проведения аукциона. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18 октября 2007 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17 октября 2007 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8-017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.**

# МАСТАЦТВА БЫЦЬ СЯМ’ЁЙ



**Залог сямейнага шчасця — саюз двух аднадумцаў, якія разумеюць адно аднаго і падтрымліваюць ва ўсіх пачынаннях. Хіба ведала Наташа, калі з заміраннем сэрца запрашала Сашу на танец, што праз дзевяць гадоў яны будуць прызнаныя лепшай сям’ёй Мінскай вобласці?.. Сёння Сляпцовы — Аляксандр, Наталля і маленькая Лера — самая дружная, самая творчая, вясёлая і знаходлівая сям’я Міншчыны па выніках II Абласнога конкурсу маладых сем’яў, які прайшоў сёлета ў Слуцку.**

***

Аляксандр давучваўся апошні курс, а Наталля ўжо выкладала дзецям мастацтва ігры на цымбалах у родным Беразіно. Бачыліся рэдка, і кожная сустрэча была сапраўдным святам. На завочнае навучанне ва Універсітэт культуры вырашалі пастунаць разам — разам і паступілі: яна — на народнае аддзяленне, ён — на духавыя інструменты. На той момант сям’я нарэшце злучылася і жыла ў Беразіно — дзяўчына не захацела пераязджаць у родную для мужа Вілейку. «Пераманіла!» — задаволена ўсміхаецца яна. Праз пэўны час на шчасце бацькам на свет з’явілася Лерачка.

Сашына навучанне не ладзілася: выкладчыка ігры на такім рэдкім інструменце, як валторна, ва ўніверсітэце не знайшлі, а перавучвацца на трубу, як яму прапанавалі, ён не захацеў. Дый сямейны бюджэт з цяжкасцю вытрымліваў двух студэнтаў-завочнікаў. Універсітэт давялося пакінуць. У невялікім райцэнтры вакансій для духавіка не знайшлося. Каб забяспечыць будучае сваёй сям’і, Аляксандр падаўся ў зусім новую, далёкую ад музыкі сферу: стаў курсантам Акадэміі МУС. Вучоба заняла ўвесь час, да жонкі і дачушкі атрымлівалася прыязджаць толькі па выхадных. «Нядзельны тата» — так жартам называлі Аляксандра ў сям’і. Катаванне разлукай скончылася праз чатыры гады. У Беразіно яго чакалі родныя і праца ў РАУС.

Аднак, нягледзячы на сур’ёзную і адказую пасаду следчага, любоў да музыкі не згасла, і труба, якой усё ж такі авалодаў настойлівы мужчына, не пакрывалася пылам у доме Сляпцовых. Тым больш што музычны талент Наталлі і Аляксандра спатрэбіўся на многіх зборах КВІМС — Клуба «маладых і вясёлых сем’яў», куды аднойчы запрасіла іх Валянціна Пытляк.

***

Валянціна Анатольеўна Пытляк ужо дзевяць гадоў кіруе раённым КВІМС. Сёння клуб налічвае 31 сямейную пару і нагадвае адну вялікую, моцную сям’ю. Яе члены разам ладзяць карысны і прыемны адпачынак: арганізуюць семінары з удзелам псіхолагаў і ўрачоў, па святах выязджаюць на прыроду, сумесна возяць дзяцей у цырк, тэатр, на экскурсіі, выступаюць на канцэртах і ў спектаклях, маюць шэфства над помнікамі Бярэзіншчыны, удзельнічаюць у розных акцыях і, вядома, у конкурсе маладых сем’яў.

— Аналагаў такога конкурсу нідзе, акрамя Мінскай вобласці, у Беларусі няма. Хіба што Віцебская вобласць славіцца сваімі сямейнымі фестывалямі, аднак гэта ўжо зусім іншы фармат, — гаворыць Валянціна Анатольеўна. — Ідэяй яго правядзення мы абавязаны гораду-пабрацiму Беразіно Кліну Маскоўскай вобласці, сябры з якога запрасілі нас на адзін са сваіх сямейных конкурсаў. Перыядычна я прапаную цікавым маладым сем’ям далучыцца да клуба, а самыя смелыя раз у год могуць праверыць свае сілы і паказаць таленты на раённым конкурсе. Наташа і Саша ў нас ужо шэсць гадоў. Ініцыятыўная, хуткая на пад’ём пара, яны сёлета адразу выйшлі ў лідары, а ў абласным туры зусім былі па-за канкурэнцыяй, пакінулі ў пераможаных чатыры сям’і: з Нясвіжа, Мар’інай Горкі, Маладзечна і Слуцка. І дзяўчынка ў іх «універсальная»: і спявае, і танцуе, і актрыса добрая, і на фартэпіяна грае...

***

Да абласнога конкурсу рыхтаваліся, як кажуць, усім светам: дапамагалі сябры па клубу, калегі, харэографы і супрацоўнікі Дома культуры, рэжысёр тэатра Мікалай Пытляк і аддзел па справах моладзі райвыканкама...

Цяжэй за ўсіх было Аляксандру — следчага РАУС ну ніяк не хацелі адпускаць на рэпетыцыі. З-за прафесійных абавязкаў і дзяжурстваў ён быў амаль адлучаны ад творчага працэсу. Многія рэпетыцыі даводзілася падладжваць пад працоўны графік Аляксандра. Часам развучвалі танец а дзесятай гадзіне вечара.

Аднак на конкурс ехалі ў поўнай баявой гатоўнасці, нацэленыя на перамогу. Выдатна былі падрыхтаваныя тры хатнія заданні: «Візітная відэакартка», «Сямейны канцэрт» і «Хатні куточак», над якім шчыравала ўся група падтрымкі. Печыва па прабабуліных рэцэптах, закаткі з фотанаклейкамі «Мая сям’я — Сляпцовы», любімыя рэчы кожнага члена сям’і — і ўсё гэта пад вершы. Як вынік — бальны максімум. Столькі ж за відэаролік пра сям’ю, зняты арыгінальна і з гумарам. У творчым жа заданні падчас танца кожны паказаў усе свае здольнасці: Лера — пластычнасць, Наталля — артыстызм, а Аляксандр — выдатнае валоданне трубой. На «ўра» для сям’і прайшлі і заданні-экспромты. Са Слуцка Сляпцовы везлі ашаламляльную перамогу і галоўны прыз — пральную машыну-аўтамат.

***

У ванны пакой новай кватэры пральная машына ўпісалася проста ідэальна.

— Даўно марылі, даўно збіраліся і — нарэшце! — летам пераехалі ў новую кватэру, — расказвае Наталля. — Стараліся разам рабіць рамонт. І ўвогуле імкнёмся ўвесь вольны час праводзіць сям’ёй. Але з-за Сашынай працы гэта бывае вельмі рэдка, таму цэнім кожную сумесна пражытую хвіліну. І адпачываем разам, і святы адзначаем толькі ўсёй сям’ёй, а калі так не атрымліваецца — пераносім на той момант, калі збяромся ўтраіх. Пасобку — ніколі!

— Калі б быў рэспубліканскі конкурс маладых сем’яў, вы б згадзіліся ўзяць у ім удзел?

— Мы абодва — авантурысты па натуры, таму было б вельмі цікава паспрабаваць. Вось толькі не ведаю, як бы Саша рыхтаваўся — ён шмат працуе.

Так, гэта я адчула і сама, бо мая сустрэча з сям’ёй Сляпцовых адбылася ў працоўным кабінеце Аляксандра а палове сёмай гадзіны вечара.

— А што ў сямейных планах? — цікаўлюся.

— Другое дзіця! Сын! — амаль у адзін голас адказваюць Аляксандр і Наталля. — Вось толькі з крэдытам за кватэру разбяромся, — агаворваецца яна.

— Хто галоўны ў вашай сям’і? — вырашаю задаць правакацыйнае пытанне я.

Аляксандр кідае на мяне сапраўдны следчы позірк:

— А вы як думаеце?!

— Вядома ж, муж, — выручае мяне Наталля, а потым лагодна, пажаночы правільна дадае: — Няхай будзе так.

**Таццяна ДАНІЛУШКІНА.**
**Фота аўтара.**

# «ВЁСКУ НАШУ НЕ ПАЗНАЦЬ — НЕ ХАЧУ ПЕРАЯЗДЖАЦЬ...»

**БЕЗ ВАДЫ... І НІ ТУДЫ, І НІ СЮДЫ**

— Вада для мяне ўсё, — на поўным сур’ёзе гаворыць заатэхнік-селекцыянер сельскагаспадарчага кааператыва «Любінова», што знаходзіцца на тэрыторыі новага аграгарадка «Чапукі». — Толькі з-за яе, не раздумваючы, у любы калгас перааеду.

У заатэхніка-селекцыянера Тэрэзы Корсак вялікая сям’я. Трое дзяцей, муж, зяць і ўнучак, якому 4 месяцы. І ўсе туляцца ў адным доме, у якім, у дадатак да гэтага, трэба тэрмінова рабіць капітальны рамонт (збіраюцца браць ільготны крэдыт).

— Побач з домам — калодзеж. Адзін на сем сем’яў. Ды яшчэ і ў аварыйным стане. Каб выкапалі новы калодзеж, трэба заплаціць больш як мільён. Мой жа месячны заробак 150 тысяч беларускіх рублёў (летам крыху больш — 200—230)... Дзе браць такія грошы?..

Каб набраць вады толькі для прыгатавання ежы, Тэрэзе Чаславаўне трэба падняцца разам з сонейкам.

— А ў мяне ж яшчэ і ўнучак маленькі. Яго купаць некалькі разоў на дзень патрэбна. А няма ў чым. Што ж рабіць? Набываем вільготныя сурвэткі... Ды і праца ў мяне такая, што без вады аніяк. Цэлы дзень на ферме, а там, разумееце, не аромамасламі пахне. Я ж у першую чаргу жанчына, хочацца прыйсці дадому і нармальна памыцца. А ў хаце і вады няма, і месца (малодшаму сынуадзінаццацікласніку даводзіцца вучыць урокі за кухонным сталом)...

Акрамя таго, у галоўнага спецыяліста з паперамі шмат работы. Дома даводзіцца дапісваць тое, што не паспявае на рабоце. Што не кажы, а спрыяльныя ўмовы — рэч немалаважная.

Старшыня сельскагаспадарчага кааператыва Васіль Яфімаў гэта разумее. Вось і выдзеліў Тэрэзе Корсак аднакватэрны домік з ваннай і водаправодам. Вады тут дастаткова, таму нікуды пераязджаць жанчыне не давядзецца.

**ЯКІ ПАЛАЦ НІ ПАБУДУЙ...**

— Попыт на новыя домікі маецца. З адзінаццаці толькі два вольныя. Мы іх трымаем для сваіх спецыялістаў, — гаворыць Васіль Рыгоравіч. — Вось наш эканаміст хутка пойдзе ў дэкрэтны водпуск. Таксама маем патрэбу ў загадчыку рамонтнай майстэрні. Безумоўна, хацелася б, каб да нас прыехалі маладыя спецыялісты. Але кожны чалавек, які думае цвяроза, пры выбары месца працы арыентуецца на заробак. І гэта нармальна. Таму які палац ні пабудуй...(*уздыхае*).

У 2005 годзе аб’ядналіся дзве гаспадаркі «Волкаўшчына» і «Любінова». З-за гэтага вось ужо тры гады некаторыя спецыялісты вымушаны дабірацца да месца працы за 20 кіламетраў.

— Будаўніцтва новых дамоў часткова выпраўляе сітуацыю. Зараз, напрыклад, наша дыспетчар з Волкаўшчыны атрымала домік недалёка ад канторы. Яна — маці траіх непаўналетніх дзяцей. Дзеці, паводле слоў жанчыны, пераязджаць не хочуць, бо тут трэба будзе хадзіць у іншую школу. Але, перакананы, што яны не пашкадуюць. У сувязі з будаўніцтвам аграгарадка, Чапукоўскай сярэдняй школе-садку выдзелілі грошы на новую мэблю, вокны з уцяпляльнікам...

Акрамя заатэхніка і дыспетчара, жыллё атрымалі, бухгалтар, механізатар... Прыярытэт аддаецца работнікам, якія добра сябе зарэкамендавалі за час працы ў кааператыве.



*Тэрэза КОРСАК вядзе мяне на экскурсію ў свае новыя апартаменты... Пад дахам яе дома прыкмеціла два гнязды ластавак. Добры знак, згадзіцеся.*

— Жыллё будуецца не толькі за кошт бюджэтных сродкаў, але і за кошт ільготных крэдытаў, якія наша гаспадарка бярэ на доўгі тэрмін. Вось і атрымліваецца, што мы сядзім у даўгавой яме. Толькі іншага выйсця ў нас няма. На Віцебшчыне проста не тыя ўмовы, што ў гаспадарках іншых абласцей. Усе грошы, атрыманыя на вытворчай сферы, ідуць на выплату заробку работнікам. На будаўніцтва дамоў, закупку тэхнікі сродкаў зусім не застаецца, — разводзіць рукамі старшыня кааператыва.

— Кватэры знаходзяцца ва ўласнасці кааператыва нават пасля наваселля. А ці рэальна з часам стаць паўнапраўным гаспадаром такога доміка? — цікаўлюся ў Васіля Рыгоравіча.

— Кожны домік тэарэтычна можна выкупіць. Ён каштуе 110—120 млн беларускіх рублёў. Але, паверце, ні адзін калгаснік не зможа за ўсё жыццё выплаціць такую вялікую суму.

У сувязі з будаўніцтвам аграгарадка ў Чапуках праходзіць рэстаўрацыя пошты, магазіна, клуба, школы, вытворчых аб’ектаў сельскагаспадарчага кааператыва.

— Мясцовыя жыхары, безумоўна, задаволены зменамі ў вёсцы. Каму не прыемна парадаваць вока прыгожым і дагледжаным?.. Але мне, як кіраўніку сельскагаспадарчага кааператыва, усё ж такі хацелася б, каб больш увагі надзялялася менавіта вытворчай сферы, закуплялася новая тэхніка. Бо, калі кароўнік будзе стаяць на падпорках, а збожжавыя не будзе чым прыбраць з поля, то знешні лоск не выратуе...

**МУЛЯРЫ, АЎ...**

— Будаўнічыя работы ў аграгарадку «Чапукі» плануем завяршыць у хуткім часе, — пераконвае кіраўнік упраўлення капітальнага будаўніцтва Леанід Лясовіч. — Гэта ўжо чацвёртае наша дзецішча. У 2005 годзе здалі ў эксплуатацыю першы аграгарадок «Туркова», які ўключае ў сябе 9 аднакватэрных дамоў.

Першы блін не стаў камяком. Гэта, на погляд Леаніда Іванавіча, адзін з лепшых аграгарадкоў. Уздоўж роўненькіх сцяжынак пасадзілі дэкаратыўныя дрэвы (на якія выдзеліў немалыя грашовыя сродкі Рэспубліканскі фонд аховы прыроды), адрамантавалі школу, будынкі сельсавета, клуба, бібліятэкі, магазіна, пабудавалі міні-кафэ.

У 2006 годзе з’явіліся яшчэ два аграгарадкі — «Цвеціна» (5 аднакватэрных дамоў) і «Мікалаёва» (10 аднакватэрных дамоў).

Побач з кожным такім аднакватэрным домам хлеў, выкладзены сцяжынкі, пастаўлены плот. Унутры таксама ўсе выгоды — унітаз, ванна, у кожным пакоі ўсталяваны пажараапавяшчальнікі. Будаваць і рэстаўраваць усе аб’екты стараемся сваімі сіламі. Толькі па неабходнасці запрашаем майстроў з іншых абласцей Беларусі.

— Не толькі ў раёне, але і ў вобласці вялікая праблема з мулярамі ў будаўнічых арганізацыях. Яны адзін за адным з’язджаюць на заробкі ў Маскву. А ў нас, акрамя будаўніцтва кватэр і рэстаўрацыі пунктаў абслугоўвання насельніцтва, рамантуюцца аб’екты вытворчай сферы (у самую першую чаргу малочна-таварныя фермы). Толькі вось часу на іх рэстаўрацыю страчваецца не чатыры-восем месяцаў, як на будаўніцтва аднакватэрнага доміка, а значна больш. З фінансаваннем жа пакуль што ніякіх праблем не ўзнікала. Рэспубліканскі фонд аховы прыроды, рэспубліканскі дарожны фонд, інавацыйны фонд своечасова выдзяляюць грошы на будаўніцтва і добраўпарадкаванне аграгарадка.



***— У нас зараз усё, як у горадзе, — гаворыць загадчыца Чапукоўскага аддзялення сувязі Зоя Ніканораўна. — І выхад у Інтэрнэт ёсць. Дарэчы, гэта паслуга, як бачыце, запатрабаваная (сапраўды, перад новенькім вадкакрышталічным маніторам сядзіць малады чалавек), і ксеракс паставілі. Нават за камунальныя і іншыя паслугі кожны можа разлічыцца электроннай карткай. Мне працаваць лягчэй стала, і аднавяскоўцам прыемней на пошту заходзіць.***

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота аўтара.**
*Міёрскі раён.*

## У Крычаве будзе музей Маці

**Раённыя ўлады мяркуюць размясціць новы музей у знакамітым Палацы Пацёмкіна, які цяпер рэстаўруецца.**

Палац Пацёмкіна — помнік архітэктуры XVIII стагоддзя. Ён быў узведзены для аднаго з фаварытаў расійскай імператрыцы Кацярыны II графа Рыгора Пацёмкіна, якому належаў і сам Крычаў. Рэстаўрацыя гэтага знакавага для горада будынка пачалася два дзесяткі гадоў таму і не была завершана, і толькі апошнім часам работы на Палацы Пацёмкіна аднавіліся. Звонку будынак амаль гатовы, да канца года мяркуецца завяршыць і ўнутранае аздабленне.

У абноўленым Палацы размесціцца раённы краязнаўчы музей і аддзел ЗАГС. Якраз для тых, хто бярэ шлюб і рэгіструе нараджэнне дзіцяці, і будзе прызначана экспазіцыя музея Маці, для якой таксама знойдзецца месца ў помніку архітэктуры.

— Мы хочам паказаць людзям ролю маці, якая стаіць ля вытокаў чалавечага жыцця, — пракаментаваў першы намеснік старшыні Крычаўскага райвыканкама Сяргей Марозаў. — Гэта будзе гістарычны экскурс ад Маці Божай да нашых дзён. Асобна вылучым перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенныя гады, калі жанчыны самі падымалі гаспадарку, дзяцей і ўсю краіну. Там будуць прадстаўлены вядомыя ў раёне жанчыны, якія ўзнагароджаны ордэнам Маці. Таксама крычаўлянкі, якія сёння спалучаюць выхаванне дзяцей з паспяховай працай, актыўнай грамадскай дзейнасцю. І тыя гераічныя жанчыны, якія акрамя сваіх дзяцей падымаюць на ногі яшчэ і сірот.

Напрыклад, экспазіцыя абавязкова раскажа пра Алену Іванаўну Маніну — партызанку, якая пасля вайны працавала ў доме-інтэрнаце і стала Героем сацыялістычнай працы. І пра Валянціну Мікалаеўну Добрусеву, якая ў нашы дні акрамя дваіх сваіх дзяцей выхоўвае яшчэ і 6 дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі. І пра многіх іншых дастойных жанчын і маці. Калі ідэя крычаўцаў ажыццявіцца, гэта будзе першы музей Маці ў краіне.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Зямельнае бязмежжа ля азёраў і рэк

**Многія самавольныя пабудовы на берагах рэк і азёраў на Віцебшчыне, аказваецца, ужо даўно «нармальная практыка».**

Бязмежныя парушэнні выявілі супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. Маштабныя праверкі праводзіліся ў цесным узаемадзеянні з органамі пракуратуры. Усяго ў кантрольных мерапрыемствах удзельнічалі больш за 200 супрацоўнікаў.

Паводле даных папярэдняй праверкі, кантралёры прыйшлі да высновы: «Намаганні асобных чыноўнікаў Браслаўскага раёна былі накіраваны не на забеспячэнне дзейснага дзяржаўнага кантролю за прытрымліваннем зямельнага і водаахоўнага заканадаўства, а на атрыманне з выкарыстаннем свайго службовага становішча зямельных участкаў для будаўніцтва жылых дамоў, іх прыватызацыю і перапродаж багатым асобам, пераўтвараўшы гэта ў высокадаходны бізнэс»...

Акрамя таго ў Плюскім сельскім Савеце Браслаўскага раёна ў 2005—2006 гадах 17 чалавек, якія не жывуць у раёне, без усялякіх на тое падстаў, вызваляліся ад выплаты зямельнага падатку і падатку на нерухомасць. Яны — жыхары Мінска, Рыгі і Даўгаўпілса (Латвія). Больш за тое, каб утаіць парушэнні, у рашэнні сельскага Савета ў 2006 годзе аб вызваленні ад выплаты падаткаў гэтыя грамадзяне былі абазначаны як пастаянна пражываючыя на тэрыторыі сельсавета. Зараз праверкі па гэтаму пытанню праводзяцца ва ўсіх сельсаветах раёна.

Некаторыя факты беззаконнасці проста здзіўляюць. У вёсцы Краснагорка Браслаўскага раёна ў прыбярэжнай паласе возера Снуды жыхар Мінска бліз прадстаўленага яму зямельнага ўчастка без дазволу... змяніў берагавую лінію возера: былі прарыты два каналы, дзе знаходзіліся тры яхты і маторны катэр.

Браслаўчанін — член садовага кааператыва самавольна ля возера Струста пабудаваў летні домік, альтанку, гараж, летнюю кухню, бетонную лесвіцу і іншыя аб’екты добраўпарадкавання.

У Віцебску ў так званай асабліва ахоўнай зоне — у парку культуры і адпачынку «Мазурына» адзін грамадзянін самавольна пабудаваў 2-павярховы цагляны дом на адлегласці 35 метраў ад прыбярэжнай паласы Заходняй Дзвіны. Будаўніцтва распачалося гадоў 10 таму. Віцебскі гарвыканкам вёў шматгадовую перапіску з гэтым таварышам. І толькі ў ходзе праверкі дзяржкантролем гарвыканкам прыняў рашэнне аб разбурэнні незаконнага дома.

А яшчэ ў Віцебску, як высветлілі кантралёры, на працягу больш як 10 гадоў грамадзяне без адводу і рэгістрацыі зямельных участкаў у прыбярэжнай паласе ракі Заходняя Дзвіна пабудавалі 268 цагляных гаражоў. Адпаведны кааператыў створаны не быў. Усяго ў Віцебскай вобласці па выніках абследавання водных аб’ектаў кантралёры ўстанавілі 173 факты самавольнага займання зямельных участкаў у прыбярэжнай паласе.

Выявілі 197 самавольна пабудаваных аб’ектаў, у тым ліку і 9 дамоў, 99 лазняў і інш. Па выяўленых фактах парушэнняў вынеслі 133 пастановы аб накладанні штрафаў на агульную суму 23,4 млн беларускіх рублёў. Добраахвотна знеслі 61 аб’ект. Згодна з рашэннямі мясцовых уладаў знеслі 40 аб’ектаў. Вынікі праверак будуць разгледжаны на сумеснай калегіі абласнога Камітэта дзяржаўнага кантролю і пракуратуры Віцебскай вобласці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ВЁСКІ ЗНІКЛЫЯ... НЕ ЗАБЫТЫЯ?

**Працяг тэмы**

*У адным з нядаўніх нумароў «Звязды» (24 жніўня) быў апублікаваны артыкул Анатоля Бутэвіча, дзе ўзгадвалася пра неабходнасць стварэння рэспубліканскай кнігі памяці пра зніклыя вёскі. Ідэя слушная, паколькі праблема надзвычай актуальная. На Вілейшчыне летась прынята цэлая раённая праграма ўвекавечання памяці зніклых вёсак. Туды мы і накіраваліся.*

**Вёска, дзе нарадзілася мая маці, напэўна, хутка назаўсёды знікне з карты Капыльскага раёна. У Дунаеве (былых Лапухах) цяпер заселены лічаныя хаты. Абапал дарогі шапацяць высачэзныя тоўстыя таполі, якія пасаджаны яшчэ ў панскія часы. Дзе-нідзе засталіся і іншыя ўспаміны пра мінуўшчыну — старое гумно, рэшткі маёнтка. Непадалёк гойдаюцца на галінках яблыкі ў здзічэлым садзе, а вакол невялікай сажалкі ўзняўся малады лес. Пустыя хаты з забітымі вокнамі і пранізлівая цішыня сустракаюць былых жыхароў, якія прыязджаюць адведаць родныя мясціны. Колькі такіх вёсак у Беларусі! Пра іх пакуль яшчэ ўзгадваюць людзі, якія тут выраслі, а што застанецца нашчадкам? З такімі думкамі пад’язджаў да Вілейшчыны, дзе імкнуцца захаваць памяць пра зніклыя вёскі.**

**СЛЕД НА КАРЦЕ**

Па колькасці населеных пунктаў Вілейскі раён, бадай, адзін з самых вялікіх не толькі ў Мінскай вобласці, а і ўвогуле ва ўсёй Беларусі. Зараз іх тут больш чым чатыры сотні. Аднак за апошнія 70 гадоў з агульнага пераліку назаўжды зніклі каля 250 паселішчаў. Наўмысна не вызначаю іх толькі як вёскі, паколькі раней класіфікацыя была больш разнастайная. Існавала мноства тыпаў населеных пунктаў. Напрыклад, той жа маёнтак — зямельнае ўладанне пана з усёй ягонай гаспадаркай. Фальварак уяўляў сабой невялікую сядзібу, а засценкам у Заходняй Беларусі звалася паселішча дробнай шляхты. Крыху больш знаёмыя нам, напэўна, хутары альбо мястэчкі (вядома, толькі па расказах дзядуляў і бабуль). Хутары — невялічкія паселішчы, дзе звычайна жыла адна вялікая сям’я (радзей некалькі), а вось мястэчка — гэта даволі буйны населены пункт. Яшчэ ўзгадвалася сяло — вялікая вёска, у якой абавязкова была царква ці касцёл, яна з’яўлялася своеасаблівым культурным і грамадскім цэнтрам той ці іншай акругі. Нават такі не вельмі падрабязны агляд дазваляе меркаваць аб тым, што сабой раней уяўляла вясковая «геаграфія». З цягам часу змянялася карта Вілейшчыны. Аб гэтым мы ўзгадвалі ў размове з мясцовым краязнаўцам Анатолем Рогачам.

— У 1954 годзе з катэгорыі пасёлкаў гарадскога тыпу перайшлі ў разрад звычайных вёсак такія даволі буйныя пасяленні, як Даўгінава і нават былы раённы цэнтр Куранец, — заўважае Анатоль Валянцінавіч. — Пазбавілася свайго ранейшага статусу мястэчка Ілля. Дарэчы, і сама Вілейка на працягу апошняга стагоддзя была цэнтрам адпаведных паветаў Вілейскай губерні Расійскай Імперыі і Вілейскага ваяводства Польскай дзяржавы, а таксама абласным цэнтрам у складзе БССР.

Грунтоўным вывучэннем гісторыі роднага краю Анатоль Рогач захапляецца вось ужо некалькі дзесяцігоддзяў. Як ён сам кажа, заўсёды быў да гэтага неабыякавы, а ў падручніках звычайна ўсе значныя падзеі «пачыналіся» хіба што толькі з Кастрычніцкай рэвалюцыі. Калі пачаў сур’ёзна займацца краязнаўствам, працаваць у архівах (дзе гэты чалавек і дасюль праводзіць амаль увесь вольны час), то адкрыў для сябе шмат цікавага. Вёска, дзе нарадзіўся Рогач, цяпер завецца Каралеўцамі. Як даведаўся краязнаўца, самыя далёкія ўзгадкі пра яе датуюцца 1443 годам. Раней яна мела назву Іжы, гэта было ўладанне Маркаўскага староства. На пачатку XX стагоддзя тут было больш чым 600 жыхароў. У Іжы мелася адметная царква, якую ў 1802 годзе пабудавалі браты Рогачы (як лічыць Анатоль Валянцінавіч, магчыма, яго продкі). Малюнкі крыжоў адсюль змешчаны ў кнізе «Кавальскае мастацтва Беларусі» — значыць, на будоўлі працавалі сапраўды выдатныя майстры. Аднак здарылася незразумелае: па рашэнню высокіх чыноўнікаў пэўны час таму царкву разабралі і перавезлі ў музей драўлянай архітэктуры і побыту пад Мінскам. Людзі вельмі бедавалі, што без храма засталіся, аднак пасля сабралі грошы і цяпер адбудоўваюць новы. Жыццё працягваецца, аднак вяскоўцаў з цягам часу становіцца ўсё менш: засталося толькі 85 жыхароў. Цяпер у Каралеўцах хат не паменела, але многія з іх стаяць пустыя...

**ВОГНЕННЫ СЛЕД**

Вывучэннем гісторыі зніклых вёсак Анатоль Рогач пачаў займацца пасля таго, як даведаўся, што Мінскім абласным таварыствам аховы помнікаў быў аб’яўлены адпаведны конкурс. Кажа, што зацікавіўся праблемай, паколькі даволі добра ведаў сітуацыю. Сабраў патрэбную інфармацыю, падагульніў і паслаў на разгляд камісіі ў Мінск. І нікольі не засмуціўся, калі даведаўся аб тым, што гэта быў дзіцячы конкурс. Тэма аказалася блізкай і знаёмай, акрамя таго, вельмі актуальнай.

— Існуе некалькі прычын знікнення населеных пунктаў, — адзначае Анатоль Рогач. — Вялікі ўрон вёсцы нанесла калектывізацыя, калі людзей ссялялі з хутароў, далучалі невялікія паселішчы да больш буйных. У мяне ёсць падрабязныя карты канца 1930-х гадоў, дзе дакладна пазначаны ўсе, нават самыя невялічкія, населеныя пункты. А пасля вайна — дзве вёскі на Вілейшчыне падчас Вялікай Айчыннай былі спалены фашыстамі разам з жыхарамі, на папялішчы пасля не адбудавана ніводнай хаты. Такі лёс 5 мая 1943 года напаткаў Боркі і Любчу.

У 1955 годзе ў Любчы на брацкай магіле быў устаноўлены памятны знак, а на месцы спаленай вёскі Боркі абеліск. Праз дваццаць гадоў (у 1975-м) у Любчы стварылі мемарыяльны комплекс: на месцы кожнага дома ўладкавана пліта з прозвішчамі яе жыхароў, а там, дзе былі спалены мужчыны і жанчыны з дзецьмі, — дзве стэлы. З усіх жыхароў вогненных вёсак выратавалася толькі адна дзяўчынка — Фаіна Сяргееўна Анасовіч цяпер жыве ў Рабуні, што на Вілейшчыне, і кожны год у пачатку мая прыязджае сюды.

Пасляваенныя гады сталі для беларускай вёскі часам аднаўлення пасля страшэннай вайны, аднак ужо ў 1960-я — новае выпрабаванне. Менавіта ў гэты час пэўную колькасць населеных пунктаў залічылі ў разрад «неперспектыўных», тым самым вызначыўшы іх далейшы лёс.

— Калі ў людзей была свая зямля, вялікая гаспадарка, то яны трымаліся за родныя мясціны, — разважае Анатоль Рогач. — Пасля вяскоўцаў практычна пазбавілі прысядзібнага ўчастка, адвучылі гаспадарыць. У 60-я гады я і сам імкнуўся да таго, каб хутчэй пашпарт атрымаць і ў горад на вучобу паступіць. Моладзь з’язджала, у выніку чаго з цягам часу вёска імкліва старэла. Зараз на Вілейшчыне каля 20 населеных пунктаў, дзе жывуць адны пенсіянеры, якіх узімку дзеці забіраюць да сябе. Ужо ў хуткім часе і гэтыя вёскі знікнуць. Ёсць і такія, дзе няма святла, усе будынкі паразбуралі, аднак дасюль не выкраслілі са спісу населеных пунктаў.

**СЛЕД... НА ДНЕ МОРА**

У 1964-м годзе многія вёскі змянілі свае прывычныя назвы на «рэвалюцыйныя». Паводле асобных звестак, такім чынам з карты Беларусі ў той час зніклі звыш 300 адпаведных тапонімаў. Вілейшчыну таксама не абмінула гэтая «кампанія» — адразу былі перайменаваны некалькі вёсак. Так Дзёхаўка перайменавалася ў Набярэжную, Дзеракі — у Горнае, Кабылле — у Кастрычніцкую, Пузава — у Лясную, Кішкарэпы — у Малькевічы, Сморкава — у Пераможац. Змены адбываліся і пасля, аднак сярод месцічаў новыя «шыльды» не прыжываліся і паміж сабой амаль заўсёды яны ўзгадвалі больш прывычныя.

Кажуць, што раней цэнтрам аднаго з калгасаў з’яўлялася вёска Хамутнае — назва як назва, мабыць, яна пайшла ад роду заняткаў тутэйшых жыхароў у мінулым. Аднак кіраўнік гаспадаркі лічыў па-іншаму: па ўласнай ініцыятыве ён устанавіў дарожны знак з надпісам «Чаромушкі». Пасля ўпарты старшыня дабіўся-такі перайменавання праз пастанову Вярхоўнага Савета БССР. І што, знікла Хамутнае? Вядома ж, засталося ва ўжытку — гэтую назву дасюль можна пачуць у тутэйшых мясцінах. Калі калясілі па Вілейшчыне, то ўдалося пабачыць вельмі цікавае пацвярджанне «двайным» назвам. Каля вёскі Залессе некалькі ўказальнікаў: новае «Залессе» і старое — «Залескія». Нетутэйшы, які не ведае сітуацыі, можа лёгка заблудзіцца. Адна з вёсак на Вілейшчыне вярнула былую назву — Зялёнае зноў стала Дуравічамі. Жыхары выйшлі з такой ініцыятывай у Вязынскі сельсавет, пасля чаго адпаведнае рашэнне было зацверджана на сесіі раённага Савета. Цяпер прывычная для месцічаў назва з’явілася на ўказальніках ля вёскі.

Па дырэктыве XXV з’езда КПСС у тутэйшых мясцінах было вырашана стварыць вялізнае Вілейскае вадасховішча. Каб зрабіць штучнае «мора» (працягласць вадаёма складае 27 кіламетраў), неабходна было перасяліць значную колькасць людзей. Што і пачалі рабіць у пачатку 1970-х гадоў. Было некалькі варыянтаў перасялення: можна было перавезці хату ў бліжэйшы населены пункт альбо нават атрымаць жыллё ў горадзе. Але як пакінуць родныя мясціны? Жыхар вёскі Малмыгі Уладзімір Мароз дасюль узгадвае сваё шчаслівае дзяцінства (падчас пераезду яму было трынаццаць гадоў) у маляўнічых мясцінах. Зараз у лесе непадалёк ад берага як успамін пра малую радзіму аднавяскоўцы ўстанавілі памятны знак, куды людзі прыязджаюць штогод 12 ліпеня на свята Пятра і Паўла. «Дасюль не магу змірыцца з тым, што мая вёска апынулася на дне, — уздыхае Уладзімір Мароз. — Увосень, калі ўзровень вады змяншаецца, месцамі бачна старая наша брукаванка...»

Усяго пад хвалямі Вілейскага вадасховішча апынуліся 10 вёсак. Сярод іх былі і даволі вялікія — напрыклад, Рыбчына вымушана пакінулі больш чым паўтысячы жыхароў. Левая частка вёскі засталася незатопленай, на беразе ўжо на працягу больш чым дзесяць гадоў на Сёмуху збіраюцца землякі. Каб узгадаць мінуўшчыну, углядаючыся ў водныя хвалі. Тут устаноўлены помнік-манумент, дзе высечаны балючыя радкі:

*Сцёрся след*
*тваёй хаты вясковай,*
*Нібы зроду яе не было.*
*Памяць вёскі,*
*затопленай морам,*
*Саграе ўспамінаў цяпло.*

Налета каля вёскі Сёмкава на Вілейшчыне плануюць узвесці мемарыял памяці загінулых вёсак — усіх амаль 250. На мясцовасці будзе пазначаны план раёна з усімі дарогамі, а таксама цэнтры сельсаветаў, на кожным з якіх на асобным камені будуць напісаны назвы населеных пунктаў, якія зніклі. Праект мяркуецца выканаць усёй талакой, паколькі клопат пра мінуўшчыну — святое.

— Па назвах зніклых вёсак можна ўзгадаць і жытняе поле (Жытнава) з пералётнымі над ім птушкамі (Журавы), — кажа Анатоль Рогач, — і вясёлую песню (Задорынка) у святочныя дні (Гульнаўка), і стромкія прыгажуны-дрэвы (Асінавец-Яловае) у самых неверагодных Барах (Малы, Сухі, Чырвоны), і мурожную траву (у Шкляным Лузе), няспынную працу старога млына (Мельнікі) і сустрэчы з каханай (Каханка), якой можа быць (Васілінкі, Ірынава, Караліна, Марусін Пасёлак), у запаветным месцы (Ціхім Вугалку)...

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*Вілейскі раён.*



***Быў светлы сад,***
***быў шчодры рай***
***і ў хаце***
***цёплы сырадой —***
***ўспамін багаты...***
***А зараз кожнаю вясной***
***сумуе бусел над вадой —***
***дзе ж тая хата?***
***На роднай,***
***ці чужой зямлі,***
***куды б сцяжынкі***
***ні вялі,***
***не стану зноскам —***
***Наш лёс***
***той кут не забываць***
***і ўсюдна ў далечы шукаць***
***след зніклых вёсак.***









**НА ЗДЫМКАХ: Вілейскі краязнавец Анатоль РОГАЧ; тут была вёска Рыбчына; сляды многіх вёсак хаваюць воды Вілейскага вадасховішча; такі арнамент вышывалі на ручніках у вёсках, якія зніклі з карты Вілейшчыны.**

# СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.




| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | | 3 | 5 | 9 | | | 6 | |
| | 5 | | 8 | | 6 | 1 | | |
| | | | 4 | | | | | 5 |
| | 7 | 1 | | 5 | | | | 4 |
| 8 | | | | | | | | 1 |
| 5 | | | | 3 | | 8 | 7 | |
| 3 | | | | | 5 | | | |
| | | 8 | 3 | | 9 | | 5 | |
| | 6 | | | 8 | 4 | 3 | | 9 |

**СУДОКУ.** Аматары бавіць вольны час за шахматамі, шашкамі, іншымі настольнымі гульнямі, крыжаванкамі, сканвордамі апошнім часам атрымалі новы цікавы занятак — разгадваць судоку. Гэтая гульня-галаваломка распаўсюдзілася па свету з Японіі.

У квадраце з 9 на 9 клетак трэба размясціць лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным гарызантальным радку, кожным вертыкальным слупку, а таксама ў кожным малым квадраціку 3 на 3 клеткі, абмежаваным тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Фестывалі

# ГАЛІНА ГАРЭЛАВА ПРЫСВЯЦІЛА ТВОР ЮРЫЮ БАШМЕТУ

**І яго можна будзе пачуць падчас Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета, які пройдзе ў гарадах трох краін — Расіі, Беларусі, Германіі. Прэм'ера твора для струннага складу аркестра беларускага кампазітара Галіны Гарэлавай прагучыць у вялікай зале Палаца Рэспублікі ў выкананні Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра «Новая Расія» пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета. Але фестываль яго імя адметны тым, што прыцягвае асобаў, сапраўдных зорак — дырыжораў і выканаўцаў, майстэрства якіх ацэнена ў свеце. Які малады музыкант не марыць выступіць разам з імі ў адным канцэрце з тым жа калектывам, на адной сцэне і ў тым жа горадзе?.. Напрыклад, на адкрыцці фестывалю ў Мінску — выступленне выдатнага скрыпача сучаснасці Гідона Крэмера. І ў тым жа канцэрце разам з маладой піяністкай Ксеніяй Башмет — малады беларускі піяніст Расціслаў Крымер. Дарэчы, менавіта ён стаў дырэктарам фестывалю Юрыя Башмета. Напэўна, ёсць закон узаемнага прыцягнення асобаў, які прываблівае публіку ў залу.**

Вось прыцягнуў жа гэты фестываль ўвагу вядомага дырыжора Рамана Кофмана, які кіруе Бетховенскім сімфанічным аркестрам горада Бона. Раман Кофман, які за сваю музычную кар'еру дырыжыраваў больш як 70 аркестрамі свету, лічыць сябе кіяўлянінам, украінскім музыкантам. Для яго прыезд у Мінск — магчымасць панастальгіраваць, прыгадаць той час, калі яму «ў Мінску было добра». Але цяпер добра тое, што шлях дырыжора перакрыжаваўся з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь. Раман Кофман падышоў да выступлення ў Мінску вельмі сур'ёзна, прыехаў загадзя, каб мець больш рэпетыцый з аркестрам, нягледзячы на тое, што ўвогуле было цяжка адарвацца ад звыклага распарадку працы. Прыйшлося нават на адзін спектакль з'ездзіць у Бон — прадырыжыраваць оперу «Сарочынская ярмарка» — і вярнуцца ў Мінск, дзе аркестр рыхтуе праграму з твораў Чайкоўскага, Моцарта, Эльгара.

— Я быў папярэджаны, што ваш аркестр — бунтар, «пугачоўскага» духу, — гаворыць Раман Кофман. — Нічога эксклюзіўнага ў гэтым няма, таму што ўсе музыканты ў свеце трошкі Сценькі Разіны. Важна толькі не секчы галовы і да ўсяго падыходзіць разумна. Галоўнае, што аркестр працуе з энтузіязмам.

Не меншы энтузіязм, трэба думаць, пануе ў іншых беларускіх аркестрах, якія выступяць у рамках фестывалю Юрыя Башмета з запрошанымі замежнымі зоркамі перад роднай беларускай публікай у вялікай зале філармоніі. Разам з Прэзідэнцкім аркестрам, напрыклад, будзе іграць выдатны піяніст прафесар Васіль Лабанаў і малады габаіст Аляксей Агрынчук. Сімфанічны аркестр тэатра оперы чакае ўкраінскага дырыжора Віктара Пласкіну, а таксама салістаў з Германіі — віяланчэлістку Мары-Элізабэт Хекер і скрыпачку Аліну Пагосткіну, якія збіраюць галоўныя прызы на буйных міжнародных конкурсах.

Але ж сам маэстра?.. Ён не толькі даў сваё імя фестывалю, большасць канцэртаў якога адбываюцца менавіта ў Беларусі. Башмета сёлета ў нас чакаюць з трыма праграмамі. Напрыклад, у Палацы Рэспублікі 21 верасня выступіць Дзяржаўны сімфанічны аркестр «Новая Расія» пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета, а на наступны дзень — камерны ансамбль «Салісты Масквы», з ім славуты альтыст выйдзе на сцэну і як саліст. Вялікім зоркам пасуе вялікая сцэна. А самая вялікая ў нас... Вядома, у Віцебску. Менавіта ў Летнім амфітэатры 23 верасня Юрый Башмет і «Салісты Масквы» сустрэнуцца з джаз-бэндам Ігара Бутмана. Што тут скажаш: віцебская публіка любіць незвычайныя сустрэчы.

Зрэшты, падыход да публікі — асаблівы клопат падчас арганізацыі падобных фестываляў. Білеты на канцэрты з удзелам сусветных зорак музыкі таннымі не зробіш. Але ўсё роўна прададзеныя білеты могуць пакрыць толькі 15 працэнтаў затрачанай на арганізацыю фестывалю сумы. Прыкладна 30—40 працэнтаў выдаткоўвае дзяржава. Але падставай для гонару ў арганізатараў стала тое, што гэты фестываль — «першая ластаўка, на якую сталі прыцягваць спонсарскія сродкі». Гэта сур'ёзнае мастацтва, а яно нідзе ў свеце не можа сябе цалкам акупляць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Сёння

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.47 | 19.20 | 12.33 |
| Віцебск — | 6.36 | 19.10 | 12.34 |
| Магілёў — | 6.37 | 19.10 | 12.33 |
| Гомель — | 6.34 | 19.06 | 12.59 |
| Гродна — | 7.02 | 19.35 | 12.33 |
| Брэст — | 7.04 | 19.35 | 12.31 |

## Месяц

*Першая квадра 19 верасня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.*** *Елізаветы, Раісы, Аўдзея, Апанаса, Глеба, Давыда;*
***К.*** *Ірмы, Ірэны, Мацея, Станіслава, Юзафа.*

# Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

# ...у суседзяў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +10 — +12 °С | МАСКВА | +19 — +21 °С Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +9 — +11 °С | РЫГА | +19 — +11 °С |
| КІЕЎ | +14 — +16 °С | С-ПЕЦЯРБУРГ | +13 — +15 °С |

Інфарм-укол

# АПЕЛЬСІНЫ ДЛЯ МОЦНЫХ КАСЦЕЙ

**Косці ўмацоўвае, як вядома, кальцый. Але апельсіны і шпінат таксама могуць зрабіць шкілет больш трывалым.**



Паводле замежных даследаванняў, у жанчын, якія звыш 5 разоў на дзень перакусвалі долькай апельсіна або шпінатам, косці набылі большую шчыльнасць, чым у тых, хто грэбаваў агароднінай і садавінай. Прыродныя антыаксіданты, якія ўтрымліваюцца ў гэтых прадуктах, дапамагаюць арганізму захоўваць кальцый.

# ПАВЫСІМ ЭНЕРГІЮ, ПЕРАМОЖАМ СТРЭС

**Адаптагены — гэта сродкі, якія дапамагаюць арганізму прыстасавацца да розных неспрыяльных уздзеянняў і дазваляюць змагацца з наступствамі фізічнага і псіхічнага стрэсу. Такімі сродкамі з'яўляюцца, напрыклад, элеўтэракок, жэньшэнь, радыёла і некаторыя іншыя расліны.**

Наогул раслінныя адаптагены павышаюць узровень энергіі, павялічваюць запас жыццёвых сіл, зніжаюць пачуццё неспакою, паляпшаюць функцыю імуннай і сардэчна-сасудзістай сістэм, паляпшаюць памяць.

ЭЛЕЎТЭРАКОК павышае ўзровень энергіі, павялічвае запас жыццёвых сіл, паляпшае функцыю імуннай сістэмы, аказвае антывірусное дзеянне, спрыяе рабоце печані, дапамагае ў прафілактыцы астэапарозу, павышае супраціўляльнасць арганізма да новаўтварэнняў, паніжае ўзровень халестэрыну і цукру ў крыві, нармалізуе сардэчны рытм, спрыяе аднаўленню арганізма пасля радыеактыўнага ўздзеяння, паляпшае памяць, візуальнае і светлавое ўспрыняцце. Не рэкамендуецца прымаць цяжарным, у перыяд кармлення, а таксама пры павышанай тэмпературы і сардэчна-сасудзістых захворваннях.

АШВАГАНДА паляпшае функцыі імуннай сістэмы, дапамагае змагацца са стрэсам, валодае антыаксідантным дзеяннем, проціракавымі вартасцямі, зніжае ўзровень халестэрыну і артэрыяльны ціск. Не рэкамендуецца для цяжарных і ў час кармлення.

ШЫЗАНДРА паляпшае памяць і яснасць розуму, абараняе печань, зніжае раздражняльнасць, спрыяе здароваму моцнаму сну. Прымяняецца пры лячэнні рэспіраторных хвароб.

РАДЫЁЛА павялічвае энергію і трываласць, паляпшае канцэнтрацыю і памяць, аслабляе наступствы стрэсаў, зніжае ціск, нармалізуе сардэчную функцыю, змяншае інтаксікацыю, абараняе печань.

РЭЙШЫ ўмацоўвае імунітэт, валодае антыаксідантным, антыбактэрыяльным, антывірусным і проціканцэрагенным дзеяннем, зніжае ўзровень халестэрыну, ціск і ўзровень цукру ў крыві. Не рэкамендуецца прымаць жанчынам падчас цяжарнасці і кармлення.

ЖЭНЬШЭНЬ умацоўвае энергію, трываласць, падтрымлівае імунітэт, умацоўвае памяць, паляпшае стан сардэчна-сасудзістай сістэмы і сэксуальную функцыю, дапамагае аднаўленню пасля радыяцыйнага ўздзеяння і прамянёвай тэрапіі, папярэджвае рак, зніжае ўзровень цукру ў крыві, аказвае дапамогу ў перыяд менапаўзы. Людзям з павышаным ціскам рэкамендуецца прымаць толькі пад наглядам урача.

УВАГА! Перад пачаткам прыёму раслінных адаптагенаў пракансультуйцеся з урачом.

Дзякуй!

# НЕ ШКАДУЮЧЫ СІЛ...

Мы, салдаты апошняй вайны, вельмі хацелі б са старонак газеты «Звязда» падзякаваць калектыву рэспубліканскага шпіталя імя П.М. Машэрава на чале з галоўным урачом Святланай Баляславаўнай Масла, усім медыкам, якія падтрымліваюць наша здароўе, якія не шкадуюць ні сіл сваіх, ні часу, ні ведаў, каб дапамагчы нам папраўіцца пасля цяжкіх працяглых хвароб. Нізкі паклон 2-му аддзяленню неўралогіі — урачу Надзеі Іванаўне Ярмоліч, медыцынскім сёстрам, санітаркам, работнікам сталовай, якія вельмі смачна гатуюць, сястры-гаспадыні Ірыне Сяргееўне Ганчарык — за заўсёдны парадак... За дабрыню, за ўменне знайсці падыход да кожнага з хворых. Дай Бог ім усім добрага здароўя!

**А.І. Лукашэвіч, В. Хамячонак, В.М. Шаройка, М.І. Віннік і іншыя.**



Дарагога брата з в. Першамайск Шчучынскага раёна віншую з 60-годдзем. Жадаю моцнага здароўя, поспехаў у працы, шчасця ў сям'і.

**Бекіш Ірына Іванаўна.**

# 18 верасня

## Дзве даты

**1830 год** — у ЗША адбылася гонка на дыстанцыю 9 міль паміж канём і першым паравозам. Першым да фінішу дабег конь.



**1981 год** — ЦК КПСС упершыню папярэдзіў партыйнае кіраўніцтва Польшчы аб тым, што ў краіне рэзка актывізаваліся антысацыялістычныя элементы. Праз некалькі месяцаў гэта прывядзе да ўнутрыпалітычнага крызісу ў ПНР і ўвядзення надзвычайнага становішча. Савецкі Саюз і іншыя краіны сацлагера былі гатовыя ўвесці ў Польшчу войскі для падаўлення гэтых выступленняў.

## Цытата дня:

***«Калі ў цябе ўсё ў парадку са страўнікам, грудзямі, нагамі, ніякія скарбонкі свету не змогуць табе нічога дадаць».***

**Гарацый (65—8 да н.э.), старажытнарымскі паэт.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства нежилого помещения общей пл. 240,4 кв. м, расположенного в многоквартирном жилом доме № 45 по ул. Юбилейная в г.Мяделе. Начальная цена снижена на 20% и составляет 42 541 722 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.04.2007 г. Аукцион состоится 02.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 01.10.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. **Контактный телефон (8-017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

# УСМІХНЁМСЯ!



**Сапраўдны хакер гэта той, хто можа ўкрасці па дамафоне прадукты з халадзільніка.**

☺

*Вяселле:*
*— Ці згодны вы ажаніцца з гэтай жанчынай?*
*— Не!*
*— А з гэтай?*

☺

**Мужчыны, запомніце — калі ў жанчыны з'яўляюцца дзеці, яна пачынае гатаваць значна лепш.**

☺

*— Наташка, у цябе раман з Віталікам?*
*— Не, зараз толькі Віталік... Рома ўчора быў.*

☺

**Кансерваторыя — гэта такое месца, куды прыходзіш у сем вечара, садзішся ў крэсла, сядзіш тры гадзіны, потым глядзіш на гадзіннік, а там толькі палова на восьмую!**

☺

*Званок у дзверы:*
*— Добры дзень, вам павестка ў армію!*
*— Як? Але ж мне 28 гадоў!*
*— Нічога-нічога, самы ўзрост.*
*— Дык я ж кандыдат навук!*
*— Не важна, з'явіцеся па ўказаным адрасе!*
*— Але ж у мяне двое дзяцей!*
*— Гэта нікога не цікавіць!*
*— Ды як вы наогул з жанчынай размаўляеце!*

Крымінал

# Паслядоўнікі Соньки-Залатой ручкі «засвяціліся» ў Брэсце

**Сярод белага дня зламыснікі абакралі ювелірны магазін у цэнтры Брэста «Ізумруд». Яны не надзявалі масак, нікога не пужалі, не рабавалі сілай. Дзейнічалі акурат як вядомая гераіня серыяла, які не так даўно пракруціла расійскае тэлебачанне.**

Пакуль двое зламыснікаў даволі ўмела адцягвалі ўвагу прадаўцоў, разыгрываючы зацікаўленых і багатых пакупнікоў, трэці сцягнуў з прылаўка 46 залатых вырабаў з брыльянтамі і 53 упрыгажэнні з чыстага золата. Сума ўрону магазіна склала 55 мільёнаў рублёў. Зладзеі — мужчыны ва ўзросце 30—35 гадоў — апрануты былі ў цёмныя курткі, гаварылі з украінскім акцэнтам.

Варта ўвагі, што ў той жа дзень у Слоніме таксама здзейснены кражы ў ювелірных магазінах, толькі трыма гадзінамі пазней.

**Яна СВЕТАВА.**

# УБАЧЫЎ ВЕРТАЛЁТ — СКІНЬ ХУТКАСЦЬ

## ДАІ выяўляе парушальнікаў і з паветра

**Кожныя выхадныя супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі Мінскай вобласці праводзяць прафілактычныя патрулі па аварыйна-небяспечных участках дарог Міншчыны на верталётах.**

— Мы лятаем у асноўным у пятніцу і нядзелю, — расказвае інспектар міжраённага аддзела экалагічнага нагляду капітан міліцыі Андрэй Парашчанка, — бо менавіта ў гэтыя дні самая вялікая перагружанасць трас, напрыклад Мінск—Магілёў, Мінск—Гродна, Заслаўе—Дзяржынск. Наша асноўная задача — выяўленне грубых парушэнняў на дарозе: абгоны, хуткасць, а таксама няправільны рух пешаходаў, асабліва ў цёмны час.

З самога верталёта штрафы пакуль што не выпісваюцца. Усе парушэнні перадаюцца на «зямныя» экіпажы, якія знаходзяцца бліжэй да месца парушэння.

— Безумоўна, гэта неабходна, — дадае камандзір верталётнага звяна Цэнтральнага аэрадрома Уладзімір Уласевіч. — Вадзіцелі бачаць верталёт і пачынаюць думаць, зніжаюць хуткасць.

Падчас аднаго рэйду нам давялося пабачыць пяць аварый. Паветраны патруль хутка перадаў на зямлю месцы здарэнняў, бо аператыўнасць тут — найпершы фактар.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**



*Андрэй ПАРАШЧАНКА і Уладзімір УЛАСЕВІЧ абмяркоўваюць дэталі паветранага патруля.*



*Са стометровай вышыні ўсе дарогі — як на далоні.*



*Сапраўдныя машыны — сапраўдныя аварыі.*

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 26 (561)

аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

## Прадаецца

■ Катэдж з усімі выгодамі каля р. Нёман, тэрмінова, 17 тыс. у.а.
Маб. тэл. 889-95-10.

■ Дом з г/п, вялікі ўчастак зямлі, 3 км ад г. Мядзел.
Тэл. (8-01797) 38-170.

■ Дом 57 кв. м з г/п у г. Крупкі, ацяпленне газавае і пячное, участак 15 сотак, калонка ў двары, 20 тыс. у.а., торг.
Тэл. (8-01796) 58-447.

■ Дом недабудаваны 10х14 двухпавярховы, 70 км ад Мінска, побач рака, чыгунка, нядорага.
Тэл. маб. 140-54-19.

■ «VW-пасат» 1995 г.в. 1,8 бензін, белы, цана па дамоўленасці.
Тэл. маб. 822-04-22.

■ «Мерсэдэс-190» 1985 г.в., 2,0Д.
Тэл. 8-029-691-67-32.

■ «VW-Гольф» 1984 г.в. 1,6 б, 1300 у.а.
Тэл. 8-029-793-85-33.

■ Радыятар да «Аўдзі-80» 1987—1991 гг. б/к, мыйка нержавеючая 80х60 см, б/к, двайная.
Тэл. (8-017) 254-99-64, 8-029-873-47-07.

■ ГАЗ-31029 1997 г.в. газ-бензін, у добрым стане.
Тэл. 8-029-145-35-43, 8-029-891-21-81.

■ Міні-трактар МТЗ-082, выдатны стан.
Тэл. 8-029-34-40-131.

■ Ружжо паляўнічае ТОЗ-34Е і сейф да яго.
Тэл. (8-01716) 40-242.

■ Мабільны тэл. «Нокіа 2610» б/к, гарантыя, 81 у.а.
Тэл. (8-017) 276-18-74.

■ Дзверы пярэднія да «VW Пасат-В2», нядорага.
Тэл. (8-01562) 246-85, 8-029-624-685.

■ «Советское фото» за 20 гадоў у пераплёце.
Тэл. (8-017) 278-72-53.

■ Электратэльфер г/п 1 тона, выдатны стан.
Тэл. 8-029-503-39-01.

■ Саджанцы парэчкі чорнай, агрэст.
Тэл. 760-28-84.

■ Самаробны трактар 20 к.с. 1200 у.а.
Тэл. (8-01770) 35-363, пасля 15.00.

■ Станок балансіровачны б/к, без дакументаў, 550 у.а.
Тэл. 8-029-617-16-97.

■ Панэлі сценавыя, уцепленыя для будаўніцтва дома, дачы, хуткі мантаж, у г. Узда.
Тэл. 8-029-691-67-32.

■ Кацёл ацяпляльны газавы бытавы, новы, нядорага.
Тэл. 8-029-564-61-42, (8-01795) 76-394.

## Куплю

■ Памяшканне пад вытворчасць, склад, офіс, магазін.
Тэл. 8-029-682-14-42.

■ Дом.
Тэл. 8-029-778-33-38.

■ Дом, кватэру ў Мінскім раёне, без пасрэднікаў.
Тэл. 8-029-114-50-29.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8-029-655-07-16.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, значкі і паштоўкі па фотатэматыцы.
Тэл. 8-029-850-17-29.

## Рознае

■ Брыгада выканае ўсе будаўнічыя работы хутка і якасна з матэрыялу заказчыка.
Тэл. 8-029-761-87-25, увечары.

■ Мяняю 1-пакаёвую кватэру з тэлефонам у цэнтры Віцебска на кватэру ў Маскве ці іншых гарадах Расіі.
Тэл. (8-0212) 96-31-62.

**У суд Першамайскага раёна г. Віцебска** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Тарабукіна Уладзіміра Леанідавіча,** 22.03.1953 года нараджэння, ураджэнца г. Віцебска, апошняе вядомае месца жыхарства: вул. 2-я Бядулі, 1—19, г. Віцебск. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Тарабукіна У.Л., паведаміць іх у суд Першамайскага раёна г. Віцебска на адрас: вул. Гарбачэўскага, 26, пак. 27, г. Віцебск на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.**

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

**Тэлефон для даведак 287-17-79.**

Пашпарт серыя__________ № __________ Выданы__________

Подпіс__________ Дата__________

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (новая версія, якая тэсціруецца)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.376 Індэкс 63850. Зак. № 5082. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12